Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
______________Ю. П. Бондар
«____»_____________2012 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____ /вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРНА-АДПАЧЫНКАВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (менеджмент), спецыялізацыі 1-23 01 11-01 03 Культурна-адпачынкавая дзейнасць бібліятэк*

Мінск
БДУКМ
2012

**Складальнік**

*В. М. Бігеза,* дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*А. П. Карзанава,* намеснік дырэктара дзяржаўнай установы «Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска»;

*В. І. Саітава,* дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

кафедрай менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 22.03.2012 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 24.05.2012 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *В. М. Бігеза*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У апошнія дзесяцігоддзі значна мяняюцца ўяўленні аб ролі культурна-адпачынкавай дзейнасці ў жыцці грамадства. Значэнне гэтай сферы дзейнасці разглядаецца ў кантэксце фарміравання і развіцця шматграннага патэнцыялу асобы, захаванні яе здароў'я. Расце патрэбнасць людзей у стасунках, у пошуках асабістай пазіцыі; прыкметамі часу становяцца аматарскія аб'яднанні, мэтавыя праекты і праграмы.

Адбыўся перагляд кіраўніцкіх тэхналогій у гэтай сферы, спосабаў, форм работы з рознымі аўдыторыямі. Сёння арыентацыя на спажыўца, фарміраванне і задавальненне яго патрэбнасцей у час правядзення культурна-адпачынкавых мерапрыемстваў становяцца прыярытэтам дзейнасці шэрагу ўстаноў культуры, у тым ліку і бібліятэк.

Дысцыпліна структуравана па раздзелах і тэмах, якія прадстаўляюць сабой адносна самастойныя адзінкі зместу навучання. Змест тэм абапіраецца ў пэўнай ступені на набытыя раней студэнтамі кампетэнцыі пры вывучэнні спецыяльных дысцыплін: «Бібліятэказнаўства», «Тэорыя інфармацыі і дакументалогіі», «Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк». Яна звязана і з блокам сацыяльна-гуманітарных дысцыплін: «Культуралогія», «Сацыялогія», «Педагогіка», «Псіхалогія».

У сваю чаргу веды і ўменні, атрыманыя пры вывучэнні дадзенага курса з'яўляюцца асновай для засваення іншых дысцыплін бібліятэчна-бібліяграфічнага цыкла: «Інфармацыйныя рэсурсы», «Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент і маркетынг», дысцыплін спецыялізацый, звязаных з падрыхтоўкай бібліятэчных прадуктаў і паслуг і задавальненнем патрэбнасцей карыстальнікаў інфармацыі.

*Мэтай* вывучэння дысцыпліны «Тэорыя і гісторыя культурна-адпачынкавай дзейнасці» з'яўляецца засваенне студэнтамі сутнасці культурна-адпачынкавай дзейнасці, садзейнічанне фарміраванню прафесійных кампетэнцый будучых бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі; развіццё і замацаванне акадэмічных і сацыяльна-асобасных кампетэнцый.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны абумоўлівае вырашэнне наступных *задач:*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– фарміраванне ў студэнтаў разумення важнасці ведаў адносна гістарычных перыядаў станаўлення і развіцця культурна-адпачынкавай дзейнасці ;

– засваенне тэрміналагічнай сістэмы, прынцыпаў, функцый, канцэпцый культурна-адпачынкавай дзейнасці;

– фарміраванне ў студэнтаў устойлівых ведаў адносна тэарэтычных асноў тэхналогіі культурна-адпачынкавай дзейнасці;

– авалоданне студэнтамі тэарэтычнымі ведамі па асновах індустрыі вольнага часу;

– азнаямленне студэнтаў з практыкай і вопытам дзейнасці культурна-адпачынкавых устаноў.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– стан і тэндэнцыі развіцця культурна-адпачынкавай дзейнасці;

– інфраструктуру культурна-адпачынкавай дзейнасці;

– суб’екты культурна-адпачынкавай дзейнасці;

– каштоўнасныя арыентацыі ў стварэнні культурна-адпачынкавага асяроддзя;

– прыярытэтныя кірункі культурна-адпачынкавай дзейнасці;

– тэарэтычныя аспекты тэхналогіі культурна-адпачынкавай дзейнасці.

У выніку засваення гэтых ведаў студэнт павінен *умець:*

– выкарыстоўваць тэарэтычныя веды ў прафесійнай і навуковай дзейнасці;

– карыстацца сучаснымі формамі і метадамі культурна-адпачынкавай дзейнасці пры правядзенні разнастайных мерапрыемстваў;

– праводзіць параўнальны аналіз і ацэнку розных тэарэтычных канцэпцый у культурна-адпачынкавай дзейнасці з мэтай прымянення назапашаных ведаў у практычнай дзейнасці;

– выкарыстоўваць вопыт работы ўстаноў культуры ў галіне культурна-адпачынкавай дзейнасці;

– наладжваць псіхалагічны кантакт з удзельнікамі ў працэсе культурна-адпачынкавай дзейнасці;

– валодаць сучаснымі метадамі эфектыўнай культурна-адпачынкавай дзейнасці.

У ліку эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць глыбокаму засваенню ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння вучэбных і даследчых задач, вылучаюцца: праблемнае навучанне, вучэбнае даследаванне, метады аналізу канкрэтных сітуацый, камунікатыўныя тэхналогіі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, круглы стол, вучэбныя дэбаты і інш.).

Самастойная работа па курсе мае кіруемы і кантралюемы характар. Яна накіравана на засваенне студэнтамі тэарэтычных асноў культурна-адпачынкавай дзейнасці.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Тэорыя і гісторыя культурна-адпачынкавай дзейнасці» ўсяго адведзена 114 гадзін, з якіх 62 гадзіны – аўдыторныя заняткі (30 гадзін – лекцыі, 16 гадзін – семінарскія заняткі, 16 гадзін – практычныя заняткі).

Рэкамендаваная выніковая форма кантролю ведаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекц. | сем. | практ. |
| Уводзіны | 2 | 2 | | |
| **Раздзел I. Гістарычныя аспекты станаўлення і развіцця культурна-адпачынкавай дзейнасці** | | | | |
| *Тэма 1.* Асноўныя этапы станаўлення культурна-адпачынкавай дзейнасці | 6 | 2 | 4 | |
| *Тэма 2.* Тэндэнцыі развіцця культурна-адпачынкавай дзейнасці савецкага і постсавецкага перыядаў | 4 | 4 | | |
| **Раздзел II. Тэарэтычныя асновы культурна-адпачынкавай дзейнасці** | | | | |
| *Тэма 3.* Тэрмінасістэма ў галіне культурна-адпачынкавай дзейнасці | 6 | 2 | 4 | |
| *Тэма 4.* Сацыяльныя функцыі і прынцыпы культурна-адпачынкавай дзейнасці | 6 | 4 | 2 | |
| *Тэма 5.* Суб'екты культурна-адпачынкавай дзейнасці | 12 | 4 | 2 | 6 |
| *Тэма 6.* Сучасныя канцэпцыі арганізацыі вольнага часу | 6 | 4 | | 2 |
| *Тэма 7.* Каштоўнасныя арыентацыі ў стварэнні культурна-адпачынкавага асяроддзя | 6 | 2 | | 4 |
| *Тэма 8.* Тэарэтычныя аспекты тэхналогіі культурна-адпачынкавай дзейнасці | 8 | 4 | 4 | |
| *Тэма 9.* Тэндэнцыі развіцця індустрыі вольнага часу | 6 | 2 | | 4 |
| **Разам …** | **62** | **30** | **16** | **16** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Прадмет, змест і задачы вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя і тэорыя культурна-адпачынкавай дзейнасці». Яе месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі будучага спецыяліста. Тэарэтычная накіраванасць курса, яго ўзаемасувязь з цыклам агульнанавуковых і агульнапрафесійных дысцыплін. Веды і кампетэнцыі, якія набываюць студэнты ў працэсе вывучэння дысцыпліны. Асноўныя віды заняткаў, арганізацыя самастойнай работы. Формы кантролю. Забяспечанасць дысцыпліны вучэбна-метадычнай літаратурай. Дэфініцыя культурна-адпачынкавай дзейнасці як цэласнай з’явы, яе сутнасць.

## Р а з д з е л І. Гістарычныя аспекты станаўлення і развіцця культурна-адпачынкавай дзейнасці

### *Тэма 1. Асноўныя этапы станаўлення культурна-адпачынкавай дзейнасці*

Вытокі станаўлення сацыяльна-культурнага ўкладу Расіі і Беларусі ў XV–XVIII стст. Першае ўпамінанне аб культурнай дзейнасці ў гістарычных хроніках. Адносіны да яе з боку ўлад і царквы. Формы адпачынкавых заняткаў прадстаўнікоў розных слаёўяў насельніцтва.

Асвета і ўзнікненне сацыяльна-культурных супольнасцей у XVIII ст. Адметнасці культурна-асветніцкай дзейнасці. З’яўленне спецыяльных пазашкольных устаноў. Дзейнасць клубаў як грамадскіх, асветніцкіх устаноў і цэнтраў адпачынку.

Змены ў сацыяльнай накіраванасці культурна-асветніцкай і адпачынкавай дзейнасці ў пачатку ХХ ст. Узнікненне і развіццё беларускіх асветніцкіх грамадскіх аб’яднанняў.

### *Тэма 2. Тэндэнцыі развіцця культурна-адпачынкавай дзейнасці савецкага і постсавецкага перыядаў*

Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый у адпаведнасці з ідэалагічнымі ўстаноўкамі ў галіне асветы, культуры, адпачынку працоўных у першыя гады Савецкай улады.

Дасягненні і негатыўныя працэсы ў сацыяльна-культурным развіцці краіны ў 20–30-я гг. Дзейнасць культурна-асветніцкіх,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыяльных установ у перадваенны час і ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Сацыяльна-культурная сітуацыя ў краіне ў першыя пасляваенныя гады. Узмацненне ўвагі да пытанняў гісторыі культурна-асветніцкай работы, тэарэтычнага асэнсавання актуальных праблем яе зместу, арганізацыі і методыкі пасля выкрыцця культу асобы.

Глыбокая перабудова культурна-асветніцкай работы ў 70–80-я гг. Дэмакратызацыя сістэмы кіравання і дзейнасці, арыентацыя на сацыяльна-культурную дзейнасць, на пераасэнсаванне прынцыпаў і функцый культурна-асветніцкай работы. Формы работы з сям'ёй. Пашырэнне дыяпазону вывучэння запытаў і патрэбнасцей розных груп насельніцтва ў сферы вольнага часу.

Змены сацыякультурнай сітуацыі ў Беларусі пасля распаду СССР.

## Р а з д з е л II. Тэарэтычныя асновы культурна-адпачынкавай дзейнасці

### *Тэма 3. Тэрмінасістэма ў галіне культурна-адпачынкавай дзейнасці*

Тэрміны «культурна-асветніцкая работа», «культурна-масавая работа», «культурна-выхаваўчая работа» як відавыя паняцці (У. Я. Трыодзін).

Перагляд навуковай і прафесійнай тэрміналогіі ў галіне культурна-асветніцкай работы ў 90-я гг. XX ст. З'яўленне ў навуковай літаратуры версій, дзе ў якасці ключавога сэнсаўтваральнага тэрміна быў «дасуг»: «педагогіка дасуга», «педагогіка вольнага часу» (М. А. Арыярскі, А. Ф. Валовік), «дасугавая дзейнасць», «культурна-дасугавая дзейнасць» (А. Д. Жаркоў, В. М. Чыжыкаў, М. Ф. Максюцін), «культуралогія дасуга» (Т. Р. Кісялёва, Ю. Д. Красільнікаў, Г. В. Галавіна) і інш.

Выкарыстанне прапанаваных практыкамі тэрмінаў «бібліятэчнае мерапрыемства», «культурна-дасугавая праграма», «культурна-асветніцкая дзейнасць», «педагогіка дасуга», «арганізацыя дасуга».

Спецыфічныя дэфініцыі дасуга.

Суадносіны паняццяў «дасуг» і «вольны час». Разнастайныя падыходы да іх разгляду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Markdown body text. Рознабаковыя трактоўкі навукоўцамі дэфініцыі паняцця «сацыяльна-культурная дзейнасць».

### *Тэма 4. Сацыяльныя функцыі і прынцыпы культурна-адпачынкавай дзейнасці*

Паняційнае вызначэнне тэрміна «функцыя». Класіфікацыя функцый і прысутнасць розных падыходаў да яе – сістэмнага, сітуацыйнага, дыферэнцаванага і інш.

Характарыстыка асноўных функцый культурна-адпачынкавай дзейнасці: камунікатыўнай, інфармацыйна-асветніцкай, культуратворчай, рэкрэацыйна-аздараўленчай, эканамічнай, функцыі нарматыўна-прававога забеспячэння і абароны канстытуцыйных свабод асобы ва ўмовах вольнага часу, фінансава-эканамічнага забеспячэння ўстаноў культурна-адпачынкавай дзейнасці, забеспячэння форм самадзейнасці насельніцтва, арганізацыя групавой, сямейнай ці асобаснай арганізацыі вольнага часу ў соцыуме.

Прынцыпы культурна-адпачынкавай дзейнасці як важнейшыя метадалагічныя катэгорыі. Мноства падыходаў у тэорыі і практыцы да іх вызначэння.

Характарыстыка агульных прынцыпаў культурна-адпачынкавай дзейнасці: прынцыпу педагагізацыі навакольнага сацыяльна-культурнага асяроддзя, асобаснага падыходу, уліку культурнай разнастайнасці ўзаемадзеючых суб’ектаў і аб’ектаў, арыентацыі на культурна-каштоўнасныя адносіны і арганізацыю культуратворчасці.

Адлюстраванне ў самой катэгорыі прынцыпу асноўных зыходных палажэнняў тэорыі, нормы паводзін і дзейнасці групы людзей, асобнага чалавека, асноўных асаблівасцей, структуры і функцыянавання розных сацыяльных інстытутаў.

### *Тэма 5. Суб’екты культурна-адпачынкавай дзейнасці*

Шматзначнасць паняцця «суб’екты культурна-адпачынкавай дзейнасці». Структура і класіфікацыя суб’ектаў культурна-адпачынкавай дзейнасці. Іх узаемадзеянне ў працэсе рэалізацыі сацыяльна-культурнай палітыкі, якая здзяйсняецца на дзяржаўным, недзяржаўным, сямейным узроўнях.

Асоба як суб’ект культурна-адпачынкавай дзейнасці. Прыярытэт творчай індывідуалізацыі асобы ў сферы вольнага часу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сацыяльна-культурныя інстытуты, разнастайныя падыходы да пабудовы іх тыпалогіі. Класіфікацыя сацыяльна-культурных інстытутаў у залежнасці ад іх ролевай функцыі адносна спажыўцоў культурных даброт, каштоўнасцей і паслуг.

Сям'я як сацыяльна-культурны інстытут. Разнастайнасць тыпаў сучаснай сям'і. Адметнасці і праблемы сямейнага адпачынку.

Сродкі масавай інфармацыі і камунікацыі. Функцыі сродкаў масавай інфармацыі як сацыяльна-культурнага інстытута. Галіновыя ўстановы сацыяльна-культурнага профілю, іх структура.

Сацыяльна-культурныя супольнасці і фарміраванні, іх тыпалогія.

Сістэма грамадскіх фарміраванняў, арганізацый, фондаў, рухаў і іншых інстытутаў як асяроддзе, якое садзейнічае сацыяльна-культурнай актыўнасці людзей у сферы вольнага часу.

### *Тэма 6. Сучасныя канцэпцыі арганізацыі вольнага часу*

Тэарэтычнае вызначэнне паняцця «дасугавыя канцэпцыі».

Характарыстыка асноўных канцэпцый паводле Т. Р. Кісялёвай і Ю. Д. Красільнікава:

– *дзейнасная канцэпцыя,* у якой рэкрэацыйная дзейнасць у вольны час разглядаецца як неад'емная частка спосабу жыцця чалавека;

– *медыка-біялагічныя канцэпцыі.* Іх аснова – выкарыстанне вольнага часу як спосабу адаптацыі чалавека да невядомых умоў прыроднага і сацыяльнага асяроддзя;

– *культуралагічныя і сацыяльна-культурныя канцэпцыі.* Іх праяўленне адносна змястоўнага напаўнення вольнага часу на падставе шматфункцыянальнага выкарыстання культурнага комплексу як сродку рэкрэацыі і адпачынку людзей;

– *экалагічныя, прыродаарыентаваныя канцэпцыі.* Вызначэнне ў іх двух тыпаў адносін чалавека да навакольнага прыроднага асяроддзя ў вольны час і ў працэсе культурна-адпачынкавай дзейнасці;

– *тэхнаэканамічная канцэпцыя,* яе дваякі сэнс адносна знаходжання аптымальнага ўзаемадзеяння вытворчай сферы і сферы быту, стварэння спецыяльнай галіны культурна-адпачынкавай дзейнасці, рэкрэацыйнага абслугоўвання, развіцця сферы культурных паслуг, індустрыі адпачынку;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– *сацыяльна-кіраўніцкія канцэпцыі*. Прыярытэтная роля ў іх грамадска-палітычных, ідэалагічных, адміністратыўных, знешнеэканамічных рычагоў упраўлення культурна-адпачынкавай сферай.

### *Тэма 7. Каштоўнасныя арыентацыі ў стварэнні культурна-адпачынкавага асяроддзя*

Вызначэнне паняцця «культурна-адпачынкавае асяроддзе», яго прадметнае напаўненне.

Адметнасці стварэння культурна-адпачынкавага асяроддзя ўстаноў культуры.

Структура культурна-адпачынкавага асяроддзя і асаблівасці яго фарміравання.

Характарыстыка ўстановы культуры і яе культурна-адпачынкавага асяроддзя ў трох асноўных аспектах: эстэтычны аб'ект, кампазіцыйная структура, аб'ект вобразнага вырашэння мастацкай творчасці спецыяліста ўстановы культуры.

Культурна-адпачынкавае асяроддзе як сродак камунікатыўнай дзейнасці.

Фарміраванне культурных цэнтраў, цэнтраў адпачынку як новых тыпаў устаноў культуры, асноўныя напрамкі іх дзейнасці.

Сучасныя тэндэнцыі развіцця тыпалогіі культурна-адпачынкавых устаноў і іх культурна-адпачынкавага асяроддзя.

### *Тэма 8. Тэарэтычныя аспекты тэхналогіі культурна-адпачынкавай дзейнасці*

Паняційнае вызначэнне тэрміна «тэхналогія» культурна-адпачынкавай дзейнасці.

Тэхналогіі як сродкі абмену чалавечымі здольнасцямі і патрэбнасцямі асобы (С. Брусаў).

Абумоўленасць тэхналогій культурна-адпачынкавай дзейнасці патэнцыялам дзеяння людзей і ўмовамі, у якіх яны праходзяць.

Структура і асноўныя рысы тэхналогіі культурна-адпачынкавай дзейнасці. Тры асноўныя групы культурна-адпачынкавых тэхналогій (паводле А. В. Сакалова, Т. Р. Кісялёвай, Ю. Д. Красільнікава).

Класіфікацыя культурна-адпачынкавых тэхналогій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя (сутнасныя) і прыкладныя (другасныя) функцыі культурна-адпачынкавых тэхналогій.

Класіфікацыя метадаў, выкарыстоўваемых у сацыяльна-культурных тэхналогіях.

Педагагічныя асновы тэхналогій культурна-адпачынкавай дзейнасці.

***Тэма 9. Тэндэнцыі развіцця індустрыі вольнага часу***

Дэфініцыя паняцця «індустрыя вольнага часу». Індустрыя вольнага часу як сфера творчай рэалізацыі асобы, прадастаўлення разнастайных форм рэкрэацыі, задавальнення культурных запытаў розных катэгорый насельніцтва.

Структура індустрыі вольнага часу ў залежнасці ад крытэрыя, пакладзенага ў аснову класіфікацыі. Тры кампаненты індустрыі вольнага часу па А. Я. Фліеру, заснаваныя на розных напрамках дзейнасці: забаўляльны; аздараўленчы; інтэлектуальны і эстэтычны.

Сучасныя асноўныя тэндэнцыі развіцця індустрыі вольнага часу.

Internet – тэхналогіі і індустрыя вольнага часу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Аксюцік, М. І.* Сацыяльна-культурная дзейнасць : гісторыка-тэарэтычныя ўводзіны : падручнік / М. І. Аксюцік, Л. В. Каралькова. – Мінск : ІСВ, 2002. – С. 6–17.

2. *Воловик, А. Ф.* Педагогика досуга : учебник / А. Ф. Воловик, В. А. Воловик. – М. : Флинта, 1998. – С. 76–87, 194–211.

3. *Домаренко, Е. В.* Культурно-досуговая деятельность библиотеки : науч.-практ. пособие / Е. В. Домаренко. – М. : Либерея, 2006. – 80 с.

4. *Дуликов, В. З.* Социально-культурная деятельность за рубежом : учеб. пособие / В. З. Дуликов. – М. : МГУКИ, 2003. – 84 с.

5. *Дюмазедье, Ж.* Эмпирическая социология досуга / Ж. Дюмазедье. – М. : Просвещение, 1974. – 46 с.

6. *Киселева, Т. Г.* Социально-культурная деятельность / Т. Г. Киселева, Ю. Д. Красильников. – М. : МГУКИ, 2004. – С. 17–43, 95–109, 143–300, 404–438.

7. *Культурно-досуговая* деятельность : учебник / под науч. ред. А. Д. Жаркова, В. М. Чижикова. – М. : МГУК, 1998. – С. 10–71, 72–106, 137–150.

8. *Социально-культурная* деятельность : теория, технология, практика : коллективная монография. Ч. 1 / науч. ред. В. Я. Рушанин ; Челяб. гос. академия культуры и искусств. – Челябинск, 2005. – С. 67–80.

9. *Социальные* и социокультурные процессы в современной Беларуси : социологический анализ : сб. науч. трудов. Вып. 6 / редкол.: Г. М. Евелькин (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Экоперспектива, 2005. – С. 343–350.

10. *Флиер, А. К.* Массовая культура и ее социальные функции [Электронный ресурс] / А. К. Флиер. – Режим доступа: www.culture.gov.ru. – Дата доступа: 15.03.2012.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

1. *Аванесова, Г. А.* Культурно-досуговая деятельность : учеб. пособие / Г. А. Аванесова. – М. : Аспект-Пресс, 2006. – 236 с.

2. *Бігеза, В. М.* Дзіцячая бібліятэка ў сістэме арганізацыі культурна-адпачынкавай дзейнасці карыстальнікаў / В. М. Бігеза // Миссия библиотеки в формировании интеллектуального потенциала общества [Электронный ресурс] / НББ ; сост. А. А. Копырина. – Электрон. данные (44 Мб). – Минск : НББ, 2007. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM). – 6 с.

3. *Бігеза, В. М.* Прафесійная падрыхтоўка бібліятэчнага спецыяліста па рабоце з дзецьмі : сацыякультурны аспект / В. М. Бігеза // Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі і сацыяльная значнасць бібліятэк : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., 29–30 кастр. 2003 г. – Мінск, 2003. – С. 141–150.

4. *Бюджет* культуры в США : собственные доходы и государственная поддержка // Отечественные записки. – 2005 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: www.strana-oz.ru/2005/4/ byudzhet-kultury-v-ssha-sobstvennye-dohody-i-gosudarstvennaya-podderzhka. – Дата доступа: 30.10.2012.

5. *Вавилова, Н. И.* Пути активизации инновационных процессов в культурно-досуговой деятельности / Н. И. Вавилова, Н. А. Грибанова. – Петрозаводск : Карелия, 1992. – 67 с.

6. *Володько, В. Б.* Проблемы функционирования учреждений культуры и искусства в период перехода к рыночным отношениям / В. Б. Володько // www.cultura-Imanadger.ru.

7. *Гнедовский, М. Б.* Творческие индустрии : политический вызов для России / М. Б. Гнедовский // Отечественные записки. – 2005 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: www.strana-oz.ru/2005/4/tvorcheskie-industrii-politicheskiy-vyzov-dlya-rossii. – Дата доступа: 30.10.2012.

8. *Голубева, И. Г.* Белорусский арт-рынок / И. Г. Голубева // Мастацтва. – 1997. – № 3. – С. 5–8.

9. *Голуб, А. М.* Формирование ценностных ориентаций молодежи в процессе досуговой деятельности / А. М. Голуб // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2009. – № 4. – С. 53–57.

10. *Жарков, А. Д.* Технология культурно-досуговой деятельности : учеб. пособие / А. Д. Жарков. – М. : Изд-во МГУК : Профиздат, 2002. – 287 с.

11. *Жаркова, Л. С.* Культурно-досуговая деятельность : теория, практика и методика научных исследований / Л. С. Жаркова, А. Д. Жарков. – М. : МГИК, 1994. – 240 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. *Игнатьева, Е.* Фандрейзинг в России – состояние и перспективы / Е. Игнатьева ; интервью вела М. Чередниченко // АРТ-менеджер. – 2002. – № 2. – С. 7–11.

13. *Кротова, Ю. Н.* Педагогика досуга в англоязычных странах : учеб. пособие / Ю. Н. Кротова. – СПбГУКИ, 1994. – 78 с.

14. *Культура :* открытый формат – 2011 (Библиотековедение, библиографоведение и книговедение, искусствоведение, культурология, социокультурная деятельность) : сб. науч. работ / науч. ред. М. А. Можейко. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2011. – С. 240–261.

15. *Культурная* политика в Европе : выбор стратегии и ориентиры : сб. материалов / сост.: Е. И. Кузьмин, В. Р. Фирсов. – М. : Либерия, 2002. – 240 с.

16. *Культурная* политика Нидерландов : (нац. докл.) : (реф.) // Панорама культурной жизни зарубежных стран / Рос. гос. б-ка. Информкультура. – М., 1995. – С. 3–14. – (Информ. сб. ; вып. 4).

17. *Национальная* культурная политика Финляндии : (докл. европ. группы экспертов) // Панорама культурной жизни зарубежных стран / Рос. гос. б-ка. Информкультура. – М., 1995. – С. 3–18. – (Информ. сб. ; вып. 5).

18. *Мир* культуры. Международная мозаика : сравнительный анализ культурной политики зарубежных стран / сост.: Е. И. Кузьмин, В. Р. Фирсов. – М. : Либерия, 2003. – 264 с.

19. *Мосалев, Б. Г.* Досуг : методология и методика социологических исследований : учеб. пособие / Б. Г. Мосалев. – М. : МГИК, 1995. – 96 с.

20. *Организация* и методика художественно-массовой работы : учеб. пособие для ин-тов культуры / под ред. Д. М. Генкина. – М. : Просвещение, 1987. – 188 с.

21. *Петрова, З. А.* Методология и методика социологических исследований культурно-досуговой деятельности / З. А. Петрова. – М. : МГИК, 1990. – 124 с.

22. *Разлогов, К. Э.* Российская культурная политика в контексте глобализации / К. Э. Разлогов // Отечественные записки. – 2005 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: www.strana-oz.ru/2005/4/rossiyskaya-kulturnaya-politika-v-kontekste-globalizacii. – Дата доступа: 30.10.2012.

23. *Титов, Б. А.* Досуг в США : учеб. пособие / Б. А. Титов, Н. А. Кострова. – СПбГУКИ, 1992. – 84 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРНА-АДПАЧЫНКАВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (менеджмент), спецыялізацыі 1-23 01 11-01 03 Культурна-адпачынкавая дзейнасць бібліятэк*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2012. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,93. Ул.-выд. арк. 0,57. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.